
Рыгор Барадулін



Г.н.  1935

# Пімен Панчанка, “Паходжанне майго друга Рыгора Б.”

***Ты прыйшоў з вайны і гора,***
***Ты – з малітвы,***
***Ты з разгневанага бору,***
***Ты смалісты.***
***Сто паэтаў цягнуць хорам,***
***Ты салістам.***
***Ты нібы святло ў лесе***
***Ад каліны,***
***Ты ад самай добрай песні –***
***Ад Куліны.***

Рыгор Барадулін – народны паэт Беларусі, крытык, перакладчык, грамадскі дзеяч. Яго імя шмат што значыць у сучаснай беларускай паэзіі. У графе “прафесія” ён звычайна ставіць “літаратар”. Нават калі віратлівыя жыццёвыя пуцявіны прымусілі б яго быць інжынерам, фінансістам, медыкам, ён усё роўна быў бы паэтам. Гэта яго прызванне, яго жыццё, яго лёс. Па спосабу светаўспрымання, спосабу бачыць з’явы і рэчы ён –



Нарадзіўся паэт на хутары Верасоўка Ушацкага раёна ў сям’і рабочага ў 1935 годзе. Падчас вучобы ў Беларускім дзяржаўным універсітэце пачынае публікавацца; пасля заканчэння БДУ працаваў у рэдакцыях газеты “Советская Белоруссия”, часопісаў “Бярозка”, “Беларусь”, “Полымя”. З 1972 г. працуе ў выдавецтве “Мастацкая літаратура”. Выступае ў друку з 1953 года. Выдаў зборнікі паэзіі “Маладзік над стэпам” у 1959 пасля паездкі разам з аднакурснікамі на збор ураджаю ў Кустанайскую вобласць, “Рунець, красаваць, наліваццa” (1961), “Нагбом” (1963), “Неруш”(1966), “Адам і Ева” (1968), “Вяртанне ў першы снег” (1972), “Рум” (1974), “Абсяг” (1978), “Вечалле” (1980), “Амплітуда смеласці” (1983), “Маўчанне перуна” (1986), “Самота паломніцтва” (1990), “Міласэрнасць

# Тэмы творчасці Барадуліна

- *У вершах Барадуліна шматстайна і напорыста гучыць **тэма Радзімы, асэнсавання свайго роду, прыналежнасці да роднай зямлі.***

  *Ад бацькі свайго*
  *ў радню*
  *Я атрымаў*
  *з дзяцінства*
  *Шырокую даланю –*
  *Тапарышча*
  *любое сцісну!*

- *Плённа развіваецца інтымная лірыка, даючы прастор чалавечай пяшчоце, багаццю пачуццяў, асабістасці.* Паэт пераканаўча паказвае, што **пачуццё кахання дапамагае чалавеку глыбей і паўней адчуваць свет, прыгажосць яго аб' ектыўнай рэальнасці.**

- Вялікую ролю ў творчасці адыгрывае сацыяльны аспект. Асоба, яе ўнутраны свет і свядомасць – вось што кранае паэта. Яго цікавяць духоўныя патэнцыі чалавека, права на індывідуальнасць, самастойнасць выбару і рашэнняў.
- Жыццёвы і ідэйны мастацкі вопыт паэта адлюстраваўся ў "Баладзе Брэсцкай крэпасці" (адзначана прэміяй Ленінскага камсамола Беларусі). Гэта паэма, якая асэнсоўвае подзвіг абаронцаў Брэсцкай цытадэлі з вышыні сучаснасці. Паэт ідзе ў гісторыю, яму дапамагае багатае асацыятыўнае мысленне. Здаецца, што яму ўсё падуладна. "Дзён сівое прадзіва ніткаю суроваю на сцяжыну прадзеда памяць выкіроўвае".
- Словатворчасць – асобная тэма ў дачыненні да яго паэзіі.Нават наватворы гучаць у Барадуліна зусім па-народнаму і добра ажыўляюць мову. Думаецца, што

# Словы матчыны з Вушаччыны
(кніга «Здубавецця»)

- *Не хваліся сеўшы, а хваліся з'еўшы.*
- *Лёг не еўшы, устаў не спаўшы.*
- *Як увойдуць злыдні на тры дні, дык і за сем год не выганіш.*
- *Карову б'ець зык, а бабу бабскі язык.*
- *Хлябай, не дбай, хоць жыдка, ды многа.*
- *Людскі рот – не гарод, не паставіш плот.*
- *Не будзь ні войтам, ні сватам, не будзеш чалавекам праклятым.*
- *Аддай рукамі, а хадзі нагамі.*
- *Чужога дзіцёнка хоць маслам маслі, а ён дзёгцем усё роўна смярдзіць.*

Ён тэмпераментна дорыць жыццё слову, таму, што падуладна толькі таленту. Ад “сонца ” ў крыві, ад улюбёнасці ў родную зямлю і родную мову, ад яснага ўсведамлення свайго дачынення да натуры, стыхіі, быцця. Ён не ўмее не жыць вершам, не ўбачыць паэтычны вобраз у любым выяўленні сутнага. Лёс Барадуліна , як і лёс кожнага паэта, абумоўлены сацыяльнымі карэннямі, часам, яго асабістай біяграфіяй. Тым часам, у якім жыве паэт, і тым, што існуе ў гістарычнай памяці народа. І яшчэ ў тым трэцім вымярэнні, у прасторы і часе душы, дзе адыходзіць на другі план падзейнае, фактаграфічнае, а ўзбуйняецца ў паэтычным



